Рэспубліка

07.03.2019

## Вяртанне праз стагоддзі

# Национальная библиотека Беларуси получила в дар факсимильное издание Лавришевского Евангелия

Наталля Іванова

**Нацыянальная бібліятэка Беларусі атрымала ў дар факсімільнае выданне Лаўрышаўскага Евангелля. У канцы 2018 года яно выйшла ў кіеўскім выдавецтве «Горобець» ва Украіне.**



Факсімільнае выданне Лаўрышаўскага Евангелля будзе цікава не толькі навукоўцам, але і простым наведвальнікам бібліятэкі.
nlb.by

— *Я меў цудоўную магчымасць мінулым летам папрацаваць з унікальным рукапісным помнікам і магу ўпэўнена казаць: гэта адна з найважнейшых святыняў нашага народа,* — расказаў **намеснік дырэктара бібліятэкі Алесь Суша.** — *Цяпер каштоўны рукапіс ранняга перыяду гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, дзякуючы выдавецкаму ўзнаўленню, стаў дасяжны даследчыкам і аматрам спадчыны беларускага Сярэднявечча.*

Лаўрышаўскае Евангелле — рукапісны помнік кніжнай культуры XIII—XIV стагоддзяў. Ён быў створаны для праваслаўнага мужчынскага манастыра пад Наваградкам, аб чым сведчаць укладныя запісы, змешчаныя ў кнізе. Лаўрышаўскае Евангелле мае адметнае мастацкае аздабленне: ілюстравана мініяцюрамі, пераплёт упрыгожаны каштоўнымі

камянямі і фігурнай металічнай пласцінай з выявай святога воіна (магчыма, князя Войшалка).

У перыяд знаходжання Беларусі ў складзе Расійскай імперыі ў XIX стагоддзі ўнікальная кніга была вывезена спачатку ў Расію, а потым — у Кракаў, дзе цяпер і захоўваецца ў Бібліятэцы князёў Чартарыйскіх. Лаўрышаўскае Евангелле праз знітаванасць нашых традыцый з’яўляецца супольнай гістарычнай каштоўнасцю чатырох краін — Беларусі, Літвы, Польшчы і Украіны.